NADACE FORUM 2000
FORUM 2000 FOUNDATION
Pohořelec 6, 118 00 Praha 1, Czech Republic

tel. +420 224 310 991 | fax +420 224 310 989
secretariat@forum2000.cz
www.forum2000.cz

# Свабоду Беларусі!

22 липня 2020

У Беларусі рэжым зноў развязаў рэпрэсіі супраць народа.
Напярэдадні абвешчаных уладамі прэзідэнцкіх выбараў, прызначаных на 9 жніўня гэтага года, пад ударам апынуліся кандыдаты ў прэзідэнты і чальцы іх камандаў, лідары апазіцыі, грамадзянская супольнасць, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі і ні ў чым не вінаватыя грамадзяне.

Два асноўныя канкурэнты, якія кінулі выклік асобе, якая займае гэтую пасаду, Сяргей Ціханоўскі і Віктар Бабарыка, а таксама чальцы іх камандаў кінутыя ў турмы. Працягваецца ціск на іх прыхільнікаў.

Дзясяткі актывістаў апынуліся за кратамі за ўдзел у законных і мірных акцыях, уключаючы вядомых лідараў апазіцыі Міколу Статкевіча і Паўла Севярынца.

Паводле інфармацыі, усе затрыманыя і арыштаваныя асобы ўтрымліваюцца ў жудасных умовах, у халодных камерах, пазбаўленыя самых элементарных сродкаў гігіены, церпяць ад катаванняў.

Незаконныя і несправакаваныя затрыманні мірных грамадзянаў прадаўжаюцца штодня з ужываннем неапраўданай жорсткай сілы.

Паводзіны існага ў Беларусі рэжыму супярэчаць усім міжнародным абавязальніцтвам краіны ў галіне дэмакратыі і правядзення выбараў.

Міжнародная супольнасць не мае права ігнараваць грубыя парушэнні правоў чалавека і асноўных свабодаў беларусаў і мірыцца з гэтым.

- Мы выказваем падтрымку народу Беларусі, які патрабуе паважаць свае правы і свабоды і выступае за свабодныя і справядлівыя выбары.
- Мы патрабуем неадкладнага і безумоўнага вызвалення ўсіх затрыманых і арыштаваных з палітычных матываў.
- Мы настойліва патрабуем ад уладаў Беларусі вярнуць людзям адпаведныя міжнародным стандартам свабодныя і справядлівыя выбары, якіх яны пазбаўленыя ўжо доўгі час.
- Мы таксама настойліва заклікаем улады Беларусі выконваць свае міжнародныя абавязальніцтвы для забеспячэння свабоды сходаў, свабоды выказвання, свабоды слова, спыніць блакаванне незалежных медыя, спыніць запалохванне журналістаў і скончыць з палітычна матываванымі пераследамі.

IČ 65992768, Městský soud v Praze, oddíl N, vložka 280
Registered by the District Court in Prague under No. 65992768; section N, insert 280

NADACE FORUM 2000
FORUM 2000 FOUNDATION
Pohořelec 6, 118 00 Praha 1, Czech Republic

tel. +420 224 310 991 | fax +420 224 310 989
secretariat@forum2000.cz
www.forum2000.cz

- Мы асуджаем эскалацыю паліцэйскага гвалту супраць мірных сходаў, у дачыненні да журналістаў і звычайных грамадзянаў, і папярэджваем улады Беларусі пра недапушчальнасць ужывання гвалту і сілы падчас цяперашняй палітычнай кампаніі.
- Мы настойліва заклікаем міжнародныя праваабарончыя арганізацыі, Еўрапейскі Звяз, дэмакратычныя краіны катэгарычна рэагаваць і ўжываць эфектыўныя захады для прадухілення небяспечных дзеянняў уладаў Беларусі.
- Мы заклікаем міжнародную супольнасць падтрымаць народ Беларусі ў ягонай барацьбе за свабоду.

**#свабодубеларусі**